

Сакрэты «Гістарычнага слоўніка»

СТАР. 4



Нашы і не толькі на «Еўрабачанні»

СТАР. 5



Трыумфальны сезон «Мінчанкі»

СТАР. 12

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 мая 2018 г. СУБОТА № 85 (28701)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## САМАЕ ПРЫГОЖАЕ СПАБОРНІЦТВА

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прысутнічаў на фінале нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь — 2018».**

Спаборніцтва паміж самымі прыгожымі дзяўчатамі краіны завяршылася на сцэне Палаца спорту. Разам з кіраўніком краіны ў глядзельнай зале «хварэлі» за ўдзельніц шоу 3,5 тысячы чалавек.

У кастынгах узялі ўдзел больш за 700 юных беларусак, аднак толькі 30 сталі фіналісткамі. Гледачы ўбачылі некалькі дэфіле, першае з іх — візітная картка. Падчас яе дзяўчаты прэзентавалі сябе не толькі гледачам у зале, але і тэлеаўдыторыі. Далей — выхад у нацыянальных строях, упершыню ў гісторыі конкурсу сюды ўвялі элементы харэаграфіі. Трэцяе дэфіле — выхад у купальніках, яго тэмай сталі II Еўрапейскія гульні. Апошняя дэфіле — у вячэрніх сукенках.

Конкурс таксама быў насычаны шоу-нумарамі з выступленнем зорак беларускай і расійскай эстрады. Падрабязнасці свята прыгажосці чытайце на сайце «Звязды» і ў найбліжэйшым нумары газеты.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

■ Парламенцкі дзённік

## СЯБРОЎСТВА І ДАВЕР ЯК АСНОВА ПАРТНЁРСТВА

**Старшыня верхняй палаты парламента расказаў кітайскім журналістам пра аспекты двухбаковай інтэграцыі**

**Шосты — фінальны — дзень насычанага тура прадстаўнікоў СМІ Кітая па Беларусі пачаўся з прэс-канферэнцыі старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіла МЯСНІКОВІЧА. На сустрэчы прысутнічалі рэпарцёры цэнтральных і рэгіянальных медыя Паднябеснай. Журналісты цікавіліся пытаннямі эканамічнага, навуковага, міжпарламенцкага ўзаемадзеяння дзвюх краін. Надзённыя тэмы — развіццё транспартных зносін і перспектывы партнёрства ў рамках ініцыятывы «Адзін пояс і адзін шлях».**

Міхаіл Мясніковіч адзначыў: «Мы даражым адкрытымі і сяброўскімі адносінамі з кітайскім народам». Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліў унікальнасць беларуска-кітайскага супрацоўніцтва, якое набыло аспект сумеснага развіцця.

Лейтматывам сустрэчы з журналістамі стала эканамічная інтэграцыя. Ад звычайнага гандлю трэба пераходзіць да маштабных праектаў — сумесных кампаній, нават з рэзідэнтамі трэціх краін. «Гэта стане каталізатарам развіцця: прамысловая кааперацыя, сумесны бізнес, фінансавыя праекты. Я падкрэсліваю: як на тэрыторыі Кітая, так і ў Беларусі», — сказаў Міхаіл Мясніковіч. У якасці прыкладу сенатар прывёў прадпрыемства «БелДжы», індустрыяльны парк «Вялікі камень», дзе створаны беспрэцэдэнтныя ўмовы для бізнесу.



Фота БелТА.

Цікавіліся журналісты і праектамі ў рамках ініцыятывы «Адзін пояс і адзін шлях».

— Мы бачым галоўную задачу ў спалучэнні эканамічнага пояса Шаўковага шляху і Еўразійскага эканамічнага саюза. На мой погляд, тут галоўнае не хуткасць, а стабільная і эфектыўная работа. Таму што тэма дастаткова далікатная, мы павінны ўлічваць усе інтарэсы. Мы лічым, што ініцыятыва «Адзін пояс і адзін шлях» вельмі правільная, і мы з ёй звязваем вялікія надзеі, — сказаў спікер Савета Рэспублікі.

Праект Шаўковага шляху спрыяе і развіццю супрацоўніцтва ў сферы чыгункі. За апошнія сем гадоў у чыгуначную гаспадарку Беларусі інвеставана два з паловай мільярды долараў.

Сапраўднай «жамчужынай» праекта «Адзін пояс і адзін шлях» называюць Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». Сёння сярод яго рэзідэнтаў 33 кампаніі з Беларусі, Кітая, Еўропы і Амерыкі. Плануецца, што да канца года іх колькасць павялічыцца да 40.

СТАР. 2

## МАЛАЯ РАДЗІМА ІВАНА І КАЦЯРЫНЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Нашы даўнія падпісчыкі — Іван і Кацярына ПАПЕЧЫЦЫ з вёскі Аброва Івацэвіцкага раёна (яны выпісваюць «Звязду» ўжо амаль трыццаць гадоў) гэтымі днямі адзначылі залатое вяселле. Маладая настаўніца, якая па размеркаванні прыехала ў старажытную вёску, і калгасны шафёр, дэмабілізаваны з арміі, стварылі моцную і працавітую сям'ю. Маладыя засталіся на малой радзіме Івана, пабудавалі сабе дом, нарадзілі дзяцей. А цяпер ужо радуюцца і дарослым унукам. Пра сваё сяброўства з нашай газетай Іван Пятровіч і Кацярына Цімафееўна кажуць: «Не ўяўляем жыцця не толькі без сваёй вёскі, але і без «Звязды» таксама, бо газета стала для нас роднай!»**

СТАР. 3

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Антон БЫЧКОЎСКІ, афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага пагранічнага камітэта:**

*«Беларускія пагранічнікі гатовыя да работы ва ўмовах правядзення ў Расіі чэмпіянату свету па футболе. Балельшчыкі, каманды, абслуговы персанал будуць праходзіць пагранічны кантроль у міжнародных пунктах пропуску на знешняй мяжы Саюзнай дзяржавы. Якіх-небудзь дадатковых кантрольных мерапрыемстваў у дачыненні да гэтай катэгорыі замежных грамадзян не прадугледжана. Разам з тым Дзяржпагранкамітэт чакае некаторага павелічэння пасажырапатоку. У гэтых умовах у пунктах пропуску з гледзішча арганізацыі пагранкантролю пры неабходнасці будуць узмоцнены пагранічныя нарады па праверцы дакументаў для забеспячэння бесперабойнага і рытмічнага пропуску грамадзян праз мяжу Беларусі».*

■ Фінансы

## НАМ БЫ ЎПЭЎНЕНАСЦЬ У РУБЛІ...

**У аснове высокіх інфляцыйных чаканняў ляжыць перш за ўсё псіхалагічны фактар**



**Гэта адзначыў у сваім дакладзе на пашыраным пасяджэнні праўлення начальнік галоўнага ўпраўлення манетарнай палітыкі і эканамічнага аналізу Нацыянальнага банка Дзмітрый МУРЫН. Па сутнасці, даклад гэты быў прысвечаны вынікам рэалізацыі грашова-крэдытнай палітыкі за студзень — сакавік гэтага года.**

### Індэкс эканамічных настрояў у плюсе

Па словах Дзмітрыя Мурына, за I квартал года наша эканоміка вырасла на 5,1 %, а дадатны ўклад у прырост ВУП зрабілі ўсе асноўныя віды дзейнасці.

Нароўні з паляпшэннем фактычнай сітуацыі застаюцца аптымістычнымі і эканамічныя чаканні дзелавых колаў. Вычышчаны ад сезоннасці зводны індэкс эканамічных настрояў, разлічаны Нацыянальным банкам паводле маніторынгу прадпрыемстваў, на працягу шасці месяцаў знаходзіцца ў дадатнай зоне. Такія чаканні рэальнага сектара спрыялі актывізацыі інвестыцыйнай актыўнасці прадпрыемстваў і павелічэнню заработнай платы работнікаў.

Разам з тым рост рэальнай заработнай платы і даходаў насельніцтва тэмпамі, якія апярэджваюць дынаміку прадукцыйнасці працы, стварае перадумовы для ўзмацнення інфляцыйнага ціску як у цяперашні час, так і ў найбліжэйшай перспектыве.

У прыватнасці, на спажывецкім рынку ўжо назіраецца высокая актыўнасць насельніцтва. Толькі за студзень — сакавік рознічны тавараабарот павялічыўся амаль на 10 % да адпаведнага перыяду мінулага года. Пры гэтым узмацняецца попыт насельніцтва на тавары замежнай вытворчасці, перш за ўсё нехарчовыя. Так, іх доля ў рознічным тавараабароце арганізацый гандлю павялічылася з 54,2 % у 2016 годзе да 55,8 % летась.

СТАР. 2

■ Прыёмная кампанія — 2018

## ВЫБАР — З ЧАТЫРОХ СЕРТЫФІКАТАЎ ЦІ... З ВАСЬМІ

**Якія магчымасці адкрываюцца перад маладымі людзьмі?**

**Абітурыенты, якія здавалі летась цэнтралізаванае тэсціраванне, але ім па нейкай прычыне не пашчасціла стаць студэнтамі, пры жаданні змогуць паспрабаваць паступіць са сваімі сертыфікатамі ў гэтым годзе. Правіламі прыёму ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі тэрмін дзеяння сертыфікатаў быў павялічаны да двух гадоў. Таму прыёмныя камісіі будуць прымаць у абітурыентаў як сертыфікаты ўзору 2018 года, так і вынікі здачы ЦТ у 2017 годзе. Таксама ў прэтэндэнта на студэнцкі білет ёсць магчымасць выбраць з вынікаў здачы ЦТ за два гады сертыфікаты з найлепшымі для сябе баламі і заявіць у прыёмную камісію, скажам, сертыфікат па матэматыцы за 2017 год, а па фізіцы — за 2018-ы. Ці выбраць найлепшы сертыфікат ЦТ па дзяржаўнай мове.**

— Спрагназаваць, колькі будзе выкарыстана мінулагодніх сертыфікатаў, вельмі складана. Я ўпэўнены, што большая частка абітурыентаў усё ж такі задаволіла свае прафесійныя памкненні і ўжо атрымлівае адпаведную адукацыю, — падзяліўся сваім меркаваннем **першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ.** — Але хачу нагадаць, што сёлета былі скарэктаваныя парогавыя значэнні па першым профільным прадмеце ўступных выпрабаванняў — яны павысіліся на 5 балаў. На гэта абітурыентам трэба звярнуць увагу, калі яны будуць фарміраваць пакет сваіх сертыфікатаў. Таксама былі скарэктаваныя і ніжнія парогавыя значэнні для паступлення на спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю і сілавога блока: мінімальны парог там цяпер складае 7 балаў.

СТАР. 4

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### СМІ ДАВЕДАЛІСЯ ПРА ЗАГАД ТРАМПА ПАДРЫХТАВАЦЬ ВЫВАД КАНТЫНГЕНТУ З ПАЎДНЁВАЙ КАРЭІ

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп аддаў загад Пентагону падрыхтаваць варыянты скарачэння амерыканскага ваеннага кантынгенту ў Паўднёвай Карэі, паведамляе газета The New York Times са спасылкай на свае крыніцы.

Скарачэнне ваеннага кантынгенту не будзе адным з прадметаў торгу на перамовах Трампа з лідарам КНДР Кім Чэн Ынам, якія павінны адбыцца ў найбліжэйшы час, адзначылі крыніцы NYT. Па словах аналітыкаў, падпісанне мірнага дагавора паміж Паўднёвай Карэяй і КНДР знізіць неабходнасць знаходжання на паўвостраве 23,5 тысячы амерыканскіх ваеннаслужачых.

Трамп і раней хацеў скараціць кантынгент у Паўднёвай Карэі, ён заяўляў, што ЗША не атрымліваюць адэкватнай кампенсацыі за размяшчэнне вайскоўцаў. Паводле пагаднення, якое заканчваецца ў канцы 2018 года, Паўднёвая Карэя аплачвае ЗША палову сумы, што трацiцца на ўтрыманне кантынгенту, — $800 млн у год. Адміністрацыя Трампа пры гэтым патрабуе, каб саюзніца цалкам аплачвала іх утрыманне.

### УРУЧЭННЕ НОБЕЛЕЎСКАЙ ПРЭМІІ ПА ЛІТАРАТУРЫ АДМЯНІЛІ З-ЗА СЕКС-СКАНДАЛУ

Фонд Нобеля падтрымаў ініцыятыву Шведскай акадэміі і прыняў рашэнне адкласці на год прысуджэнне прэміі па літаратуры ў 2018 годзе. Пра гэта гаворыцца ў прэс-рэлізе на сайце арганізацыі.

«На працягу апошніх некалькіх тыдняў мы вялі бесперапынны дыялог са Шведскай акадэміяй, і мы падтрымліваем яе рашэнне адмяніць уручэнне ўзнагароды ў 2018 годзе», — гаворыцца ў паведамленні фонду, які, згодна з шведскім законам, нясе адказнасць за рэалізацыю завяшчання Альфрэда Нобеля і ўзнагароджанне лаўрэатаў.

На працэс прысуджэння прэмій у іншых абласцях у 2018 годзе, як адзначылі прадстаўнікі гэтай арганізацыі, рашэнне не паўплывае. Яно, як паказвае Reuters, было прынята ў сувязі з секс-скандалам, з-за якога шэраг членаў Шведскай акадэміі яе пакінулі.

«Крызіс у Шведскай акадэміі адмоўна адбіўся на Нобелеўскай прэміі. Рашэнне адмяніць уручэнне ўзнагароды ў 2018 годзе падкрэслівае сур'ёзнасць сітуацыі і дапаможа захаваць доўгатэрміновую рэпутацыю ўзнагароды», — упэўнены ў фондзе Нобеля.

### ДЗЯРЖДУМА 8 МАЯ МОЖА РАЗГЛЕДЗЕЦЬ КАНДЫДАТУРУ ПРЭМ'ЕРА, КАЛІ ЯНА БУДЗЕ ЎНЕСЕНА



Дзяржаўная дума на пленарным пасяджэнні ў аўторак, 8 мая, можа разгледзець кандыдатуру на пасаду прэм'ер-міністра Расіі, калі яна будзе ўнесена да гэтага часу прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі. Пра гэта паведаміў у пятніцу ТАСС першы віцэ-спікер ніжняй палаты парламента Іван Мельнікаў.

«8 мая плануецца пасяджэнне Дзярждумы. У выпадку, калі да гэтага моманту прэзідэнтам будзе ўнесена кандыдатура прэм'ера, яна можа быць разгледжана на гэтым пасяджэнні», — сказаў Мельнікаў.

Інаўгурацыя прэзідэнта РФ Уладзіміра Пуціна адбудзецца 7 мая. Згодна з канстытуцыяй краіны, не пазней як у двухтыднёвы тэрмін пасля ўступлення на пасаду прэзідэнт павінен прадставіць на ўзгадненне Дзярждуме кандыдатуру старшыні ўрада, на разгляд якой дэпутатам адведзены тыдзень.

ISSN 1990 - 763X

КОРАТКА

**Беларускія дзіцячыя кардыяхірургі ўпершыню ў краіне зрабілі аперацыю па замене клапана лёгачнай артэрыі празскурным доступам праз прасвет сасуда.**

Мотаклуб AnGirls грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» сёння праводзіць мотапарад. Такім чынам беларускія матацыклісткі далучыліся да акцыі JUST RIDE, якая ўжо 12-ы раз праводзіцца ў свеце і другі — у Беларусі.

**У краіне павялічаны грашовыя нормы расходаў на дзяржаўнае забеспячэнне дзяцей-сірот.**

Каля 300 мінамётных мін выяўленыя пры ўзворванні на полі ва Ушацкім раёне. Снарады знаходзіліся на двух участках памерам 2-3 метры, размешчаных побач. Боепрыпасы вывезены сапёрамі ў бяспечнае месца і знішчаны.

■ Вёска будучага

## Годныя ўмовы працы, быту і заробкі,

**або У чым пасяховасць сучаснага аграгарадка?**

**Вёска Лазавічы знаходзіцца дзесьці за дваццаць пяць кіламетраў ад Клецка, можна сказаць, на самым ускрайку раёна. Паскоранае яе развіццё пачалося ў 2007 годзе, з наданнем статусу аграгарадка.**

— Аграгарадок Лазавічы рос і мяняўся на нашых вачах. Былі заасфальтаваны вуліцы, пад'езды да фермаў, вытворчых аб'ектаў, уладкаваны тратуарныя дарожкі. З'явілася ўся неабходная сацыяльная інфраструктура, вырасла новая вуліца Маладзёжная. Базавая гаспадарка — адкрытае акцыянернае таварыства «Лазавічы» выдзяляла тут жыллё ў асноўным моладзі, — кажа **намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Галіна ПАЮТА.**



**Сямейная дынастыя: Анатоль БАРНАТОВІЧ, Жанна НІКАНОВІЧ і Галіна ПАЮТА.**

Дарэчы, акрамя яе ў Лазавічах жывуць і працуюць родныя брат і сястра Галіны Адамаўны — Анатоль Барнатовіч — брыгадзірам трактарнай брыгады, Жанна Нікановіч — загадчыцай сталовай. Сапраўдная сямейная дынастыя.

СТАР. 3